УДК 378.4.0161(476.1+476.5):94

В. А. Астрога, дацэнт БДУ

# ВЫВУЧЭННЕ І ВЫКЛАДАННЕ ЎСЕАГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ НА КАФЕДРАХ ГІСТОРЫІ МАЛАДЗЕЧАНСКАГА І АРШАНСКАГА НАСТАЎНІЦКІХ ІНСТЫТУТАЎ

The article analyses the establishment and development of the chairs of history of Molodechno and Orsha Teacher Training Institute in 1940–1950th years. It deals with issues of the chairs personel potential, problems of developing of subjects teaching methods, scientific research topics. The article actualizez specific activity of each Institute and the reasons for their closing. It also concludes on their place and role in the system of Higher education of BSSR. The publication is made on the unpublished archival of zonal state Archives of Molodechno and Orsha.

**Уводзіны.** Вывучэнне станаўлення і развіцця беларускай гістарычнай навукі, нягледзячы на даволі шматлікія публікацыі, застаецца і па сённяшні дзень маладаследаванай галіной гістарычных ведаў. Вучоныя ў першую чаргу аналізавалі дзейнасць буйных навуковых цэнтраў, якія знаходзіліся ў сталіцы і абласных цэнтрах БССР. Вывучаючы гісторыю універсітэтаў і абласных педагагічных інстытутаў, гісторыкі амаль не надавалі ўвагі мінуламу стварэння і дзейнасці невялічкіх рэгіянальных, у асноўным раённых, настаўніцкіх інстытутаў, часцяком зачыненых у 1950-я гг. У выніку на сённяшні дзень па-за навуковай распрацоўкаю застаюцца цэлыя нявывучаныя праблемы.

Гэткім чынам, неабходнасць далейшага вывучэння гісторыі мясцовых, рэгіянальных беларускіх навуковых і адукацыйных асяродкаў так званага «другога эшалона» ў галіне гісторыі несумненна. Асабліва актуальна гэта ў сферы даследавання праблем усеагульнай гісторыі, бо яны найменш распрацаваны ў айчыннай гістарыяграфіі. У гэтай сувязі дзейнасць кафедр гісторыі Маладзечненскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута (МлДНІ) і Аршанскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута (АДНІ) у 1940–1950-х гг. уяўляе адназначна вялікі інтарэс. Менавіта настаўніцкія інстытуты ва ўзаемадзеянні з абласнымі педагагічнымі інстытутамі, а МлДНІ і з БДУ, займаючыся навучальнай і навуковай дзейнасцю, мусілі стаць падмуркам для развіцця гістарычнай навукі і адукацыі ў рэгіёнах Беларусі.

**Асноўная частка.** Маладзечанскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут (МлДНІ), які быў утвораны на базе Мінскага настаўніцкага інстытута, кантынгенту яго выкладчыкаў і студэнтаў, згодна пастанове Савета Міністраў БССР № 301 ад 12. 07. 1947 г. стаў адзіным вну ў новай Маладзечанскай вобласці і ўвогуле першым за ўсю гісторыю Маладзечна. Ён мусіў рыхтаваць настаўнікаў 5–7-х класаў сямігадовых і сярэдніх школ і меў дзеля гэтага пяць профільных аддзяленняў, у тым ліку гістарычнае. Кожнае аддзяленне мела адпаведную кафедру. Кафедра гісторыі, адзіная кафедра гістаддзялення, займалася падрыхтоўкай настаўнікаў гісторыі. Арганізавана яна была ў жніўні 1947 г. і з 1 верасня яе першай загадчыцай стала былая выпускніца аспірантуры БДУ (1938 г.), нядаўняя выкладчыца гісторыі СССР Мінскага настаўніцкага інстытута Л. С. Мінзурэнка [1, л. 8]. Штат кафедры ўвесь час быў мінімальны, з 1947 па 1948 гг. – 2 чалавекі, у 1949 – 3, а з 1950 па 1953 гг. – 4 [2, л. 7]. Сталай выкладчыцай усеагульнай гісторыі была З. Х. Савельзон. Сярод сумяшчальнікаў, якія чыталі гэты курс, была А. С. Шандора (гісторыя СССР і ўсеагульная гісторыя). Безумоўна, гэткімі сіламі праводзіць паўнавартасную навучальную і навукова-даследчую працу было складана. Тым больш што дзейнасць маладзечанскай кафедры гісторыі, як і ў іншых настаўніцкіх інстытутах, прыпала на цяжкія і напружанныя пасляваенныя гады, перыяд новага ціску на грамадскае жыццё і навуку, час змагання з «касмапалітызмам і нізкапаклонствам перад Захадам», што ўжо само па сабе накладала абмежаванні на развіццё гістарычнай навукі, асабліва ўсеагульнай гісторыі, тым больш у небагатай кадрамі і навуковымі традыцыямі тагачаснай Беларусі.

Трэба сказаць, што на навуку ў МлДНІ звярталі ўвагу з самага моманту яго заснавання. З персаналу дырэкцыя ўстановы імкнуліся выціснуць максімум, неаднаразова крытыкуючы супрацоўнікаў за нездавальняючую навуковую дзейнасць. Яе ўзровень і сапраўды быў невысокім. З гэтым пагаджаліся нават самі выкладчыкі. Так, ў красавіку 1948 г. на педнарадзе інстытута загадчыца кафедры Мінзурэнка казала: «…кафедра… працуе слаба, таму што працуюць малакваліфікаваныя кадры, ідэйна-палітычны ўзровень выкладчыкаў стаіць на нізкім узроўні, праца па павышэнню кваліфікацыі вядзецца саматужна, трэба яе палепшыць, прыцягнуць кваліфікаваныя сілы, палітзаняткі студэнтаў таксама стаяць на нізкім узроўні, трэба іх паляпшаць…» [3, л. 14]. Нават у бібліятэцы інстытута абсалютна адсутнічала літаратура па гісторыі.

У хуткім часе, зыходзячы з наяўных магчымасцяў, было прынята рашэнне, што ў навуковай працы адпаведных кафедраў найбольшая ўвага будзе нададзена на назапашванне краязнаўчага

матэрыялу. У выніку на кафедры гісторыі гэтым вымушаны былі заняцца і спецыялісты па ўсеагульнай гісторыі. Дарэчы, падобную карціну мажліва было назіраць ва ўсіх настаўніцкіх інстытутах рэспублікі. У гэтай сітуацыі кафедра пачала праводзіць кансультацыі для настаўнікаў школ горада. Напрыклад, напачатку 1948 г. была арганізавана вечарына, прысвечанная 800-годдзю Масквы, у студзені 1949 г. усталявана сувязь з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам (МДУ) імя Ламаносава, які ўзяў шэфства над інстытутам і аказаў дапамогу ў камплектаванні літаратураю бібліятэкі і вучэбных кабінетаў [4, л. 7]. А вось план навукова-даследчай працы на 1948 г., нягледзячы на тое, што ён быў зацверджаны АН БССР, не выконваўся, і ўвогуле праца над ім была прызнана нездавальняючай і найгоршай ў інстытуце, хаця, па меркаванні дырэктара, навуковая праца ў інстытуце – «найбольш закінутая пляцоўка» [5, л. 22]. Пэўна таму 26 жніўня 1948 г. з фармулёўкаю «за недабрасумленнае стаўленне да працы і адсутнасць усялякага кіраўніцтва кафедрай» Л. С. Мінзурэнка была вызвалена з пасады загадчыцы і звольнена з працы [6, л. 34]. Але на той час у рэспубліцы спецыялістаў настолькі не хапала, што Мінасветы БССР адразу накіраваў яе зноў… загадчыцай кафедры гісторыі ў Берасцейскі настаўніцкі інстытут [7, л. 2, 22]. Аднак і пры новай кіраўніцы З. Е. Гурарый, былой выпускніцы МДУ (спецыялізацыя па ўсеагульнай гісторыі), навука «не пайшла». Праз пяць месяцаў загадчыка зноў змянілі, і ім стаў Е. М. Рынбург, адзіны за ўсю гісторыю кафедры кандыдат гістарычных навук, былы выпускнік Камуністычнага універсітэта Беларусі і аспірантуры пры Мінскім педінстытуце. Пры ім навуковая дзейнасць пачала наладжвацца. Рынбург узяў для даследаванняў тэму «Выяўленне і апісанне гістарычных помнікаў на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці», вёў студэнцкі навуковы гурток, а астатнія выкладчыкі (Куляшова і Савельзон) рыхтаваліся да здачы кандыдацкага мінімуму [8, л. 17–21].

Пэўнае ажыўленне ў навуковае жыццё інстытута мусіла прынесці адзначэнне 10-гадовага юбілею ўз'яднання Заходняй і Савецкай Беларусі, з нагоды якога дырэктар, але чамусці толькі 30 верасня 1949 г., загадаў «прызначыць камісію для падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў, звязаных з гэтай гістарычнай датай, у складзе старшыні Рынбурга Е. М. і членаў Смоліна З. Д. (кафедра педагогікі) і Ермаловіча М. І. (кафедра літаратуры)» [9, л. 106]. А на павінную адбыцца навуковую сесію «10 лет восседнения белорусского народа в едином белорусском советском государстве» супрацоўнікі кафедры планавалі выступіць з дакладамі. Але і пры Рынбургу праз тыя ж кадравыя праблемы навуковая праца не наладзілася. Больш таго, з цяжкасцямі ішоў і навучальны працэс. Калі недахоп выкладчыкаў па ўсеагульнай гісторыі можна зразумець, і патрэбы ў пэўнай ступені закрываліся сумяшчальнікамі з Мінска, у першую чаргу Савельзон, то па гісторыі Беларусі кафедра не мела да 1951 г. ніводнага выкладчыка [10, л. 35]. У верасні 1951 г. Е. М. Рынбург быў звольнены з працы.

Наступная загадчыца, Л. Ц. Куляшова, былая выпускніца Мінскага педінстытута, прысланая ў жніўні 1949 г. з Пастаўскага педвучылішча, толькі часова выконвала свае абавязкі і натуральна не ў стане была за некалькі месяцаў працы на нешта паўплываць, і са студзеня наступнага года в. а. загадчыка становіцца М. Я. Багалюбаў, які працаваў у гэты час над кандыдацкай дысертацыяй «Индустриализация Белоруссии в годы первой пятилетки» [11, л. 69].

На той момант кафедра налічвала 5 чалавек: М. Я. Багалюбаў, З. Х. Савельзон, Л. Ц. Куляшова, А. С. Шандора і лабарант М. В. Крыўка. Але і Багалюбаў не даў рады арганізаваць выкладчыкаў, а можа і не надта хацеў, бо весь інстытут ведаў, што 1952/53 навучальны год – апошні год існавання гістарычнага аддзялення. Тым не менш, праз пару месяцаў, 18 красавіка, на Вучонай Радзе інстытута кафедра гісторыі падверглася літаральнаму разгрому з боку дырэкцыі – «…па колькасным складзе выкладчыкаў гэта кафедра можа поўнасцю выконваць праграму… [але] па сутнасці яны нічога не робяць ў гэтай галіне… калі гэта лайдацтва ў галіне ўласнага росту і найдалей будзе працягвацца, то дырэкцыя вымушана будзе ставіць пытанне перад Мінасветаю аб вакантных месцах па ўсеагульнай гісторыі і гісторыі СССР…» [12, л. 14]. Аднак, як адзначалася вышэй, гэтая «навальніца» ўжо не палохала гісторыкаў, бо з 1 верасня 1952 г. набор на 1 курс не праводзіўся, вучэбная нагрузка зменшылася і адна частка выкладчыкаў была вызвалена ад працы, а другая ўвайшла ў склад кафедры асноў марксізму-ленінізму, дзе выкладала гісторыю ў мінімальным аб'ёме – у прыватнасці, Савельзон старажытную і новую гісторыю. У ліпені 1953 г., калі быў апошні выпуск гісторыкаў, двое застаўшыхся выкладчыкаў, Багалюбаў і Савельзон, былі звольнены, засталася толькі адна Шандора, якая працавала на той момант загадчыцай кабінета асноў марксізму-ленінізму і звольнілася напрыканцы жніўня 1954 г. [13, л. 39–40]. На гэтым гістарычнае навучанне і навука ў МлДНІ спыніліся, а праз 2 гады, 25 жніўня 1953 г. паводле пастановы Савета Міністраў СССР увогуле спыніў сваю працу і сам настаўніцкі інстытут [14, л. 158].

Што датычыцца кафедры гісторыі другога рэгіянальнага настаўніцкага інстытута – Аршанскага, то ягонае аднаўленне пачалося ў 1944 г. і праходзіла літаральна на «пустым месцы». У адроджаным інстытуце, як і да вайны,

было вырашана сфармаваць гістарычнае аддзяленне. Яшчэ да стварэння кафедры гісторыі ў інстытут у жніўні 1944 г. прыехаў М. О. Слабодзіч [15, л. 6], які стаў з 1 жніўня выкладчыкам гісторыі СССР [16, л. 2].

У верасні была ўтворана кафедра гісторыі і 2 кастрычніка 1944 г. яе першым загадчыкам стаў А. І. Лазоўскі, які пачаў працу ў інстытуце з 28 верасня [17, л. 10]. Ён жа стаў і намеснікам дырэктара па завочным навучанні. Разам з ім на кафедры застаўся працаваць і Слабодзіч [18, л. 1]. Але настолькі малакольксасная кафедра не мела магчымасці праводзіць навукова-даследчую працу. Як адзначалася ў яе справаздачы за 1945/46 навучальны год: «Кафедра ў асноўным займалася праграмна-метадычнымі пытаннямі, мала стаялі на паседжанні кафедры пытанні навукова-даследчага характара. Буйным недахопам у гэтай працы з'яўляецца адсутнасць на кафедры навуковых сіл, а таксама адсутнасць у цэлым у інстытуце плана навукова-даследчай работы, не лічачы раскладу часу здачы членамі кафедры кандыдатскага мінімуму і напісання дысертацыі…» [19, л. 17]. Неабходна адзначыць, што выкладчыкі кафедры працавалі над кандыдатскімі дысертацыямі. Так, Лазоўскі вывучаў тэму «Сінайкізм у V–IV стст. да н. э.», Слабодзіч займаўся праблемамі гісторыі сярэднявечча [20, л. 4]. Аднак праз практычна поўную адсутнасць фінансавых сродкаў у інстытута ні Лазоўскі, ні Слабодзіч не далі рады выехаць у камандзіроўкі для паглыбленай працы над дысертацыямі. Гэта не дало магчымасці кафедры гісторыі АДНІ разгарнуць адукацыйную і навуковую працу. Спыненне з 1950 г. набору на спецыяльнасць «Гісторыя» і плануемая ліквідацыя гістарычнага аддзялення аднялі гэтую перспектыву. Пачалося звальненне выкладчыкаў ці перавод іх на 0,5 стаўкі па прычыне змяншэння вучэбнай нагрузкі. У апошні 1950/51 навучальны год існавання кафедры на ёй працавала тры чалавекі: Лазоўскі, Мухін і Слабодзіч, які выкладаў новую гісторыю [21, л. 6]. У 1951 г. пасля ліквідацыі кафедры ўсе яе выкладчыкі былі звольнены. Пасля закрыцця гістарычнага аддзялення нядоўга праіснаваў і сам інстытут. У 1955 г. у сувязі з рашэннем Урада СССР аб узбуйненні вну Аршанскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут быў зачынены.

**Заключэнне.** Такім чынам, гісторыя стварэння і дзейнасці кафедр гісторыі Маладзечанскага і Аршанскага дзяржаўных настаўніцкіх інстытутаў выразна дэманструе ўсю складанасць развіцця рэгіянальных навучальна- і навукова-гістарычных цэнтраў ва ўмовах дэфіцыту кадраў і фінансава-матэрыяльных сродкаў.

Гэтыя кафедры занялі асаблівае месца ў гісторыі гістарычнай навукі і адукацыі Беларусі. Да моманту свайго расфармавання яны былі адносна значнымі навуковымі асяродкамі і мелі перспектывы да свайго развіцця ў рэгіёнах. Супрацоўнікі гэтых кафедр дэманстравалі пэўны навуковы ўзровень, аднак жыццё распарадзілася так, што маладзечанскія і аршанскія гісторыкі вымушаны былі ўмацаваць іншыя навучальныя ўстановы. На сённяшні дзень у гэтых беларускіх гарадах вышэйшых навучальных устаноў няма, але дзейнасць настаўніцкіх інстытутаў трывала ўвайшла ў гісторыю Маладзечна і Оршы, сталі спадчынай колледжаў, якія дзейнічаюць у гэтых гарадах, асабліва Аршанскага педагагічнага коледжа Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава.

### Літаратура


1. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. – Фонд 551. Маладзечанскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут Міністэрства адукацыі БССР г. Маладзечна. 1947–1955 гг. – Воп. 2. – Спр. 1. – Л. 8.
2. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 3. – Л. 7.
3. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 14.
4. Там жа. – Л. 7, 19, 28.
5. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 4. – Л. 22.
6. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 2. – Спр. 4. – Л. 34.
7. ЗДА г. Баранавічы. – Фонд 637. – Воп. 2. – Спр. 182. – Л. 2, 22.
8. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 5. – Л. 17, 21.
9. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 2. – Спр. 4. – Л. 106.
10. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 6. – Л. 35.
11. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 2. – Спр. 4. – Л. 69.
12. Там жа. – Спр. 28. – Л. 14.
13. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 16. – Л. 39–40.
14. ЗДА г. Маладзечна. – Фонд 551. – Воп. 2. – Спр. 28. – Л. 158.
15. Аршанскі занальны дзяржаўны архіў (Аршанскі ЗДА). – Фонд 646. Аршанскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут Міністэрства адукацыі БССР г. Орша. 1944–1955 гг. – Воп. 1. – Спр. 5.
16. Аршанскі ЗДА. – Фонд 646. – Воп.1-л. – Спр. 116.
17. Аршанскі ЗДА. – Фонд 646. – Воп.1-л. – Спр. 105.
18. АршанскіЗДА. – Фонд. 646. – Воп. 1. – Спр. 2а.
19. Аршанскі ЗДА. – Фонд 646. – Воп. 1. – Спр. 12.
20. Аршанскі ЗДА. – Фонд 646. – Воп. 1. – Спр. 20.
21. Аршанскі ЗДА. – Фонд 646. – Воп. 1. – Спр. 59.